**1 мая 1959 год. Перадавыя людзі завода**. Добрымі поспехамі ў працы сустрэлі свята ільнозаводаўцы. Яны выканалі план красавіка больш чым на 110 працэнтаў. Змена выконваючага абавязкі майстра Шаўчука Вікенція Дзмітрыевіча выканала план мінулага месяца да 25 красавіка, а змена Крыловай Марыі Іванаўны – да 28.

Лепшымі людзьмі завода лічацца Вікенці Шаўчук, Марыя Зайцава, Надзежда Жаўняк, Таццяна Цюлькова. Усе яны занесены на заводскую Дошку гонару.

**Купрэеў, М. Перадавыя людзі завода / М. Купрэеў // Авангард. – 1959. - 1 мая. – С.1.**

**1 мая 1974 год. З узнагародай!** На падставе Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР узнагародзіў ордэнамі і медалямі вялікую групу маці Гомельшчыны. Сярод узнагароджаных ёсць і працаўніцы нашага раёна. Ордэнам “Мацярынская Слава III ступені” узнагароджпны работніца саўгаса імя Чапаева Фядосся Антонаўна Кузьмянкова, калгасніца калгаса “Бальшавік” Таісія Іванаўна Расцяжэнка.

**28 мая 1974 год. Віншуем з узнагародай!** За поспехі ў распаўсюджванні маладзёжнага друку на 1974 год сакратар камсамольскай арганізацыі райвыканкома У. Лашкевіч, сакратар камсамольскай арганізацыі Лужкоўскай сярэдняй школы У. Палевіч узнагароджаны Ганаровымі граматамі абкома ЛКСМБ. Ганаровай граматы ЦК ЛКСМ Беларусі ўдастоена камсамольская арганізацыя саўгаса “Стараградскі” за развіццё трусагадоўлі.

Віншуем з узнагародай, таварышы!

**Цюлеў, Г. Віншуем з узнагародай! / Г. Цюлеў / Зара над Сожам. – 1974. – 28 мая. – С.2.**

**1 мая 1979 год. Рыхтуемся да ўборкі траў.** Штогод гаспадарка набывае новую кормаздабываючую тэхніку. Сёлета куплен сіласаўборачны камбайн “Віхр”. Зараз у калгасе ёсць чатыры трактарныя касілкі, тры сіласаўборачныя камбайны. Прыступілі да іх рамонту. На гэтай рабоце заняты слесары Валерый Восараў, Яўген Кавальчук. Даведзеныя заданні яны штодзённа выконваюць на 115 працэнтаў.

**Палаўкова, Т.  Рыхтуемся да ўборкі траў / Т. Палаўкова // Зара над Сожам. – 1979. – 1 мая. – С.3.**

**17 мая 1979 год. Прыгажэе вёска.** З кожным годам прыгажэе цэнтральная сядзіба саўгаса імя Валадарскага – вёска Барсукі. Вядзецца будаўніцтва жылля. Хутка прымуць навасёлаў чатыры дамы. Пад два дамы закладзены падмуркі. У вёсцы ўтварылася яшчэ адна новая вуліца.

**Красакова, Я. Прыгажэе вёска / Я. Красакова // Зара над Сожам. – 1979. – 17 мая. – С.2.**

**3 мая 1984 год. Будуецца школа.** Выдатны падарунак рыхтуюць дзецям хлебаробаў саўгаса “Руднянскі” будаўнікі ПМК-50. У жніўні гэтага года яны здадуць у эксплуатацыю будынак сярэдняй школы на 392 месцы.

Зараз на будаўнічай пляцоўцы поўным ходам вядзе работы брыгада муляраў, якую ўзначальвае Аркадзь Раманюк. За першы квартал бягучага года будаўнікі асвоілі 166 тысяч рублёў пры плане 160 тысяч.

**Агляд падрыхтавала бібліятэкар-краязнаўца цэнтральнай раённай бібліятэкі Агеенка Ю.В.**